# ВЫХАВАННЕ ПАДРАСТАЮЧАГА ПАКАЛЕННЯ СРОДКАМІ МУЗЕЙНАЙ ЭКСПАЗІЦЫІ (з вопыту работы Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея)

**В. Ю. Кацічава,** *малодшы навуковы супрацоўнік Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея*

Адна з галоўных задач, якую ставіць перад сабой кожны музей, – фарміраванне паўнавартаснай асобы, стварэнне ўмоў для павышэння эстэтычнага і адукацыйнага ўзроўню чалавека, а таксама развіццё здольнасці арыентавацца ў гісторыі, мастацтве, архітэктуры, літаратуры і іншых профільных музею навуках. Музею як асобаму сацыяльна-культурнаму інстытуту грамадства належыць вельмі важная роля ў выкананні сваёй адукацыйнай функцыі, неад'емным вектарам якой з'яўляецца патрыятычнае выхаванне дзяцей і моладзі. Іншымі словамі, сучасныя музеі розных профіляў здзяйсняюць вельмі важную місію фарміравання дасведчанай, адукаванай асобы, сапраўднага грамадзяніна, патрыёта сваёй Бацькаўшчыны. Сацыяльна-палітычныя рэаліі апошняга часу сведчаць, што эканамічная дэзынтэграцыя, сацыяльная дыферэнцыяцыя грамадства, дэвальвацыя духоўных каштоўнасцей зрабілі даволі негатыўны ўплыў на грамадскую свядомасць большасці сацыяльных і ўзроставых груп насельніцтва [3, с.13]. Абыякавыя адносіны да культурнай спадчыны, эгаізм, незацікаўленасць гісторыяй сваёй радзімы, яе мовай і традыцыямі – усё гэта вядзе да страты культурай сваёй вызначальнай ролі ў грамадстве. Музеі Беларусі валодаюць вялікім патэнцыялам на шляху прыпынення гэтага дэструктыўнага працэсу, адраджэння гонару за сябе і сваю Айчыну.

Перш чым характарызаваць і аналізаваць працу навуковых супрацоўнікаў Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея па выхаванні пачуцця патрыятызму ў дзіцячай і маладзёжнай аўдыторыі, якая складае асноўную базу ўсіх наведвальнікаў, варта звярнуцца да этымалогіі слоў *патрыёт, патрыятызм*. Паводле этымалагічнага слоўніка рускай мовы Фармеса Марса, слова патрыёт запазычана з французскага patriote – *сын айчыны*. Грэчаскае patriotes – *зямляк, суайчыннік* таксама выкарыстоўваецца для характарыстыкі слова патрыёт [4]. Згодна з тлумачальна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

словаўтваральным слоўнікам Т.Ф. Яфрэмава, патрыётам называецца той, «хто любіць сваю айчыну, адданы свайму народу, гатовы на ахвяры і подзвігі ў імя інтарэсаў сваёй радзімы» [5]. Патрыятызм вызначаецца як «маральная пазіцыя, якая выяўляецца ў любові да радзімы, гонары за яе поспехі і дасягненні, у павазе да яе гістарычнага мінулага, культурных традыцый, у гатоўнасці прыйсці на дапамогу ў цяжкія часы, абараніць яе незалежнасць ад заваёўнікаў, ахвяраваць жыццём…» [6]. Відавочна, што словы *патрыёт* і *патрыятызм* шматгранныя, складаныя ў сваім разуменні паняцці. Дзеля таго каб быць сапраўдным патрыётам, недастаткова толькі любіць радзіму, трэба рабіць вялікія намаганні для таго, каб гонар і павага да свайго роднага краю былі апраўданымі не толькі для нас, але і для нашых нашчадкаў. Таму ў слове *патрыятызм* можна вылучыць некалькі складнікаў: любоў да радзімы; веданне гісторыі свайго краю; павага да роднай мовы і традыцый; імкненне захаваць гісторыка-культурную спадчыну сваёй краіны. Наяўнасць і разуменне ў грамадстве ўсяго вышэйпералічанага спрыяе фарміраванню патрыятычна выхаванай асобы.

Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей мае вялікі вопыт у рабоце з падрастаючым пакаленнем у кірунку патрыятычнага выхавання. Пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны ў 50–60-я гг. XX ст. музей інтэнсіўна камплектаваўся не толькі матэрыяламі археалагічных раскопак, узорамі медальернага мастацтва і зброяй, але і прадметамі, якія мелі дачыненне да падзей 1941–1945 гг. [7, с.3]. На сёння распрацаваны шэраг праграм, адаптаваных для рознага ўзросту, з улікам узроставых і псіхалагічных асаблівасцей дзяцей і моладзі. Такія праграмы дапамагаюць дзецям зразумець значнасць мінулых гістарычных падзей для краіны ў цэлым, а ў прыватнасці, быць здольнымі атаясамліваць сябе з мінулым і сучасным, такім чынам, быць уключанымі ў ход гісторыі. Як вядома, без мінулага няма будучыні. Шырокай папулярнасцю сярод школьнікаў і студэнтаў карыстаюцца экскурсіі і заняткі, прысвечаныя ваенным падзеям на тэрыторыі Беларусі. Супрацоўнікі Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея распрацавалі і праводзяць тэматычныя экскурсіі, прысвечаная падзеям Вялікай Айчыннай вайны, адаптаваныя для школьнай і студэнцкай аўдыторыі. Для вучняў малодшых класаў праводзіцца інтэрактыўны занятак «Гродзеншчына ў гады Вялікай Айчыннай вайны», дзе асаблівая

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўвага надаецца аповедам аб дзецях–удзельніках Вялікай Айчыннай вайны на Гродзеншчыне. Гэта вельмі важна і неабходна для ўключэння ў тэму маленькіх наведвальнікаў, а таксама дапамагае слухачам супаставіць сябе з героямі-аднагодкамі.

Да 200-годдзя вайны з Напалеонам вырашана стварыць перасоўную выставу «Ад Нёмана…да Нёмана». Супрацоўнікі навукова-асветнага аддзела з выставай наведалі амаль усе школы горада Гродна, а экскурсіі на гэтую, здавалася б, забытую тэму падаліся школьнікам вельмі цікавымі. Дарэчы, у снежні 2012 г. музеем сумесна з аддзелам адукацыі Гродзенскага гарвыканкама запланавана і праведзена віктарына сярод навучэнцаў школ Гродна на тэму вайны 1812 года.

Безумоўна, любоў да радзімы выхоўваецца не толькі шляхам пазнання баявых старонак гісторыі. Веданне агульнай гісторыі свайго краю – гэта адно са складнікаў патрыятызму. У сувязі з гэтым неабходна адзначыць, што Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей робіць вялікія поспехі менавіта ў краязнаўчым кірунку. Так, рашэннем Гродзенскага гарадскога выканаўчага камітэта ад 19.02.2003 г. № 103 была падрыхтавана музейна-педагагічная праграма «Гродназнаўства», мэтазгоднасць якой пацверджана прысуджэннем музею прэміі «За духоўнае адраджэнне 2007 года» Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь «за распрацоўку і ўкараненне музейна-педагагічнай праграмы “Гродназнаўства”» [1]. Галоўнай мэтай стварэння праграмы з’яўлялася патрыятычнае выхаванне дзяцей і моладзі, фарміраванне патрыятычных адносін да сваёй спадчыны, павагі да сваіх каранёў, да беларускай гісторыі, а ў нашым выпадку – да гісторыі роднага горада. Меркавалася, што музей стане своеасаблівай школай гарадскога патрыятызму. Адметнасць «Гродназнаўства» ад іншых падобных праграм у тым, што базай для атрымання ведаў сталі музей, яго экспазіцыі, выставы і сам горад: яго вуліцы, плошчы, будынкі, памятныя мясціны. Менавіта такое асяроддзе стварае эмацыянальныя ўмовы для вандроўкі ў мінулае, выхоўвае гонар за родны горад, падтрымлівае цікавасць да ведаў, а значыць – спрыяе дасягненню пастаўленых мэт. Праграма «Гродназнаўства» разлічана на паэтапнае ўвядзенне, гэта значыць, што яна ахоплівае ўсе ўзроставыя катэгорыі школьнікаў, уключае шэраг заняткаў, экскурсій, а таксама нетрадыцыйных формаў культурна-адукацыйнай дзейнасці, якія праз музейныя прадметы, макеты, навукова-дапаможныя, ілюстрацыйныя матэрыялы дапамагаюць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

школьнікам даведацца самае цікавае не толькі пра гісторыю горада, але і пазнаёміцца з жыццём знакамітых гістарычных, палітычных, грамадскіх і навуковых дзеячаў, лёс якіх цесна звязаны з Гродна.

Асабліва складаная праца па стварэнні і правядзенні заняткаў, экскурсій для выхаванцаў дзіцячых садкоў, а таксама для малодшых школьнікаў. Работа з такой аўдыторыяй мае сваю спецыфіку і патрабуе ад навуковага супрацоўніка музея не толькі ведання дзіцячай псіхалогіі, музейнай педагогікі, але і ўмення праяўляць творчыя здольнасці, уносіць крэатыў і разнастайнасць у заняткі і экскурсіі, каб не страціць увагу маленькіх экскурсантаў. Сярод цікавых трэба адзначыць занятак для дзяцей малодшага школьнага ўзросту «Вітаўт – уладар горада Гродна», падчас якога дзеці будуюць макет старажытнага замка, знаёмяцца з асобай вялікага князя. Музейныя заняткі для пачатковых класаў абавязкова ўключаюць моманты гульні, тэатралізацыі, практычныя заданні ці праблемныя пытанні ў форме цікавых творчых заданняў. Дзеці на такіх занятках – не проста пасіўныя слухачы, а актыўныя ўдзельнікі гульні, размовы ці творчага працэсу. Не менш захапляльны і пазнавальны занятак «Стэфан Баторый і Гродна», у ходзе якога вучні атрымліваюць уяўленне аб каралі Рэчы Паспалітай, а таксама аб матэрыяльным жыцці на тэрыторыі Беларусі ў XVI ст.

Выхаванне патрыятызму пачынаецца ўжо з дзіцячых гадкоў. Разумеючы гэта, музей не спыняецца на дасягнутым, а распрацоўвае новыя інтэрактыўныя заняткі, святы, сустрэчы, святочныя вечарыны для дзяцей дашкольнага ўзросту і малодшых школьнікаў. Так, у гэтым годзе была ўдасканалена музейная батлейка. Лялечнае прадстаўленне «Раство Хрыстова» дапоўнена сцэнай на гістарычную тэму «Пажар у замку Вітаўта». Намаганнямі супрацоўнікаў навукова-асветнага аддзела быў складзены вершаваны сцэнарый на беларускай мове на сапраўдныя гістарычныя падзеі, якія адбываліся ў далёкім XIV ст. Батлейка з новым сцэнарыем дэбютавала на Першым нацыянальным форуме «Музеі Беларусі». На дэманстрацыйнай пляцоўцы лялечным прадстаўленнем былі ўражаны не толькі дзеці, але і дарослыя. У хуткім часе плануецца таксама рэалізацыя новай праграмы для дзяцей і іх бацькоў «Калядныя сустрэчы ў музеі».

Для вучняў сярэдніх класаў і студэнтаў прапанаваны тэматычныя экскурсіі «Зброя мінулых стагоддзяў», «Сведкі вячыстай славы», «Гродзенская архітэктурная школа» і інш. Згаданая музейна-педагагічная праграма дастаткова ёмістая, яна знаёміць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

наведвальнікаў не толькі з гістарычнымі постацямі і іх лёсам, важным з’яўляецца і тое, што вучні і студэнты маюць выключную магчымасць пазнаёміцца з унікальнай архітэктурай Гродна. Менавіта для гэтага ў рамках праграмы існуе цыкл пешаходных экскурсій па горадзе – «Гарадзенскія вандроўкі». На гэтым этапе адбываецца знаёмства з унікальнымі помнікамі архітэктуры XII ст., з гісторыяй забудовы Старога і Новага замкаў, старажытнымі гарадскімі могілкамі.

Што датычыцца студэнцкай аўдыторыі, то для гэтай катэгорыі наведвальнікаў, акрамя пешаходных і тэматычных экскурсій, заняткаў, распрацаваны шэраг лекцый на розныя тэмы. «Яўрэйскі Гродна», «Іх імёнамі названыя вуліцы Гродна», «Кнігадрукаванне на Беларусі», «Жанчыны ў гісторыі Гродна – славутыя і невядомыя», «Жывапіс мастакоў-перадзвіжнікаў» – усё гэта далёка не поўны спіс лекцый, якія з задавальненнем слухаюць вучні старшых класаў і студэнты.

Варта, нарэшце, адзначыць вельмі важныя складнікі патрыятызму – любоў і павага да роднай мовы і культуры. Наш музей вядзе актыўную работу па абуджэнні цікавасці да роднай мовы, культурнай спадчыны Беларусі. Усе заняткі, лекцыі і экскурсіі праводзяцца на беларускай мове, а тэма культуры ў музейнай экспазіцыі з’яўляецца адной з ключавых. Больш падрабязна даведацца пра культуру на нашых землях у розныя часы можна наведаўшы тэматычныя экскурсіі, лекцыі і заняткі «Культура Беларусі XVI–XVIII стст.», «Дзеячы навукі і культуры XIX ст.», «Сустрэчы са старажытнай кнігай», «Легенды і паданні Беларусі», «Страчаная спадчына», «Захаваныя каштоўнасці».

Усе вышэйзгаданыя складнікі паняцця патрыятызму неабходны для стварэння моцнага падмурка сапраўднага грамадзяніна, свядомага сына сваёй Айчыны, гэта гарантыя таго, што патрыятызм – норма нашага грамадства. У музеяў Беларусі для гэтага ёсць усе магчымасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

---

1. *Каментарый* да Указа № 705 «Аб прысуджэнні прэміі “За духоўнае адраджэнне” 2007 года». – URL : http ://president.gov.by/by/ search.html.

2. *Ластоўскі, В.* Што трэба ведаць кажнаму беларусу / В. Ластоўскі; пашырыў Я. Найдзюк. – Мінск : Т-ва беларус. мовы імя Ф. Скарыны, 1991. – С. 23.

3. *Мацевасян, А.Р.* Выхаванне патрыятызму сродкамі ваенна-гістарычных музеяў / А.Р. Мацевасян // Пазашкольнае выхаванне. – 2008. – № 2. – С. 13–15.

4. *Патриот* – URL : http : // www.classes.ru/all-russian/russian-dictionary-Vasmer-term-9348.htm#foreign.
5. *Патриот* – URL : http ://www.classes.ru/all-russian/russian-dictionary-Vasmer-term-9348.htm#foreign.
6. *Патриотизм* – URL : http : //www.onlinedics.ru/slovar/fil/p/patriotizm.html.
7. *Царук, В.М.* Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей : нарыс-даведнік / В.М. Царук. – Слонім : Слонім. друкарня, 2011.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ